ДАРОГАМІ ПЕРАМОГІ

# Апошні бой – ён цяжкі самы...

## 2 МАЯ 1945 Г., 1411-Ы ДЗЕНЬ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ.

**У зводках Савінфармбюро паведамлялася: «Войскі 1-га Беларускага фронту пры садзейнічанні войскаў 1-га Украінскага фронту пасля зацятых вулічных баёў завяршылі разгром Берлінскай групы нямецкіх войскаў і цалкам авалодалі сталіцай Германіі горадам Берлін».**

Яшчэ 19 студзеня 1945 г. у ходзе Вісла-Одэрскай стратэгічнай наступальнай аперацыі войскі 1-га Украінскага фронту выйшлі на тэрыторыю Германіі ў Верхняй Сілезіі, а 28 студзеня польска-германскую мяжу перасеклі палкі 57-й гв. стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту, байцы якой пакінулі на той мяжы шчыт з надпісам, што менавіта яны былі тут першымі. Праз некалькі дзён гвардзейцы па лёдзе пераправіліся праз Одэр і захапілі на варожым беразе плацдарм у раёне Кюстрына. Адсюль у красавіку 1945 г. і пачнецца Берлінская стратэгічная наступальная аперацыя.

У пяць гадзін раніцы 16 красавіка 1-ы Беларускі фронт пачаў артпадрыхтоўку на 27-кіламетровым участку прарыву: 25 хвілін больш дзесяці тысяч ствалоў артылерыі, рэактыўных сістэм, мінамётаў крушылі нямецкія пазіцыі.

**А пасля пры святле 143-х зенітных пражэктараў нашы войскі пайшлі ў атаку.**

Хтосьці спытае: а навошта трэба было ўчыняць такую «ілюмінацыю»?! Тыя пражэктары добратакі «падсвечвалі» і савецкіх байцоў! А сэнс у гэтым быў. І не толькі, каб знянацку ашаламіць праціўніка. На той час у Германіі запусцілі ў серыйную вытворчасць першыя сістэмы начнога бачання. Асляпіць, вывесці са строю абсталяванне, адчувальнае да яркага святла, і павінны былі пражэктары. Ды і вочы фашыстаў, канешне ж, пражэктары сляпілі.

Першую паласу варожай абароны чырвонаармейцы прабілі за паўтары-дзве гадзіны, месцамі выйшлі да другой паласы. Аднак потым немцы ачухаліся, падцягнулі рэзервы. Бой стаў яшчэ больш жорсткім. Але як бы адчайна гітлераўцы ні абараняліся, як бы ярасна ні контратакавалі, Чырвоную Армію было ўжо не стрымаць. Праз тры дні савецкія войскі поўнасцю авалодалі Зеелаўскімі вышынямі, а 21 красавіка часці 1-га Беларускага фронту ўварваліся ў прыгарады Берліна.

Ужо на подступах да Берліна выявілі сябе мужнымі і смелымі воінамі нашы землякі. Напрыклад, **Аркадзь Кулак** з Баянічаў, радавы 250-га стралковага палка 82-й стралковай дывізіі. У баі за населены пункт Нойбарнім 16 красавіка ён, кінуўшы гранату на гарышча дома, знішчыў двух засеўшых там нямецкіх снайпераў. А да таго першым дасягнуў варожага акопа і закідаў яго гранатамі. За праяўленыя мужнасць і адвагу Аркадзь Мікітавіч і быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

Ці Аляксандр Івашкевіч з Ямінска, малодшы сяржант, аўтаматчык матарызаванага батальёна 65-й танкавай брыгады. У баях за берлінскі прыгарад Ліхтэнберг 22 красавіка Аляксандр Мацвеевіч са свайго аўтамата знішчыў пяцёрку фрыцаў. А затым, праследуючы праціўніка, уварваўся на ўсходнюю ўскраіну Берліна, паўзком падабраўся да варожай супрацьтанкавай гарматы, гранатай знішчыў і яе, і яе разлік, адкрыўшы шлях нашым танкам. Узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

Або Антон Вярыга з Баянічаў, яфрэйтар, аўтаматчык матарызаванага батальёна 44-й гв. танкавай брыгады. У баях за Карлсхорст 24 красавіка 1945 года ён атрымаў заданне знішчыць двух гітлераўскіх снайпераў, што трымалі пад прыцэлам перакрыжаванне дарог. Антон Іванавіч пераапрануўся ў цывільнае і пад выглядам мясцовага жыхара зайшоў у тыл снайперам. І, асцярожна падабраўшыся да іх схованкі, аднаго прырэзаў кінжалам, а другога застрэліў з пісталета. Тут на Вярыгу выскачыў трэці немец, але хлопец не разгубіўся: падхапіў снайперскую вінтоўку і ва ўпор уклаў фашыста. Праўда, і сам быў паранены. Камандаванне брыгады ўзнагародзіла яго ордэнам Чырвонай Зоркі.



Аркадзь Нікіфаравіч КУЛАК.



Яўген Фёдаравіч ГАРЭЛЬКА.



Андрэй Яфімавіч АТРАШОНАК.



Яўген Сцяпанавіч ЛЯЎЧЭНЯ.



Фёдар Антонавіч РУДЫ.



Сцяпан Раманавіч ПАЖАРЫЦКІ.



Пётр Рыгоравіч ЖЭЧКА.

Войскі Чырвонай Арміі 25 красавіка ўзялі Берлін у шчыльнае кальцо, баі перайшлі на гарадскія вуліцы, дзе савецкія войскі сустрэлі жорсткае супраціўленне немцаў. Вораг і не думаў здавацца. Абапіраючыся на падземныя камунікацыі, на барыкады, на шматлікія гарадскія збудаванні, што ашчацініліся гарматамі і фаўстпатронамі, кулямётамі і аўтаматамі, праціўнік не толькі ўпарта абараняўся, але і раз-пораз шалёна контратакаваў. Нашы дзейнічалі штурмавымі групамі, узмоцненымі сапёрамі, артылерыяй і танкамі.

**Вечарам 28 красавіка савецкія войскі выйшлі ў раён рэйхстага, а 30 красавіка пачалі штурм гэтай сапраўднай крэпасці.**

1 мая ў руках абаронцаў Берліна застаўся толькі ўрадавы квартал і Ціргартэн. У гэты дзень фашысты паспрабавалі дамовіцца наконт перамір'я, але савецкае камандаванне настойвала на поўнай і безагаворачнай капітуляцыі. Немцы адмовіліся, баі зноў разгарэліся. І толькі ў ноч на 2 мая берлінскі гарнізон пачаў складваць зброю.

Так завяршылася Берлінская стратэгічная наступальная аперацыя.

За вулічныя баі ў сталіцы Германіі заслужыў ордэн Славы III ступені Аляксандр Галай з Арлёва, радавы 236-га гв. стралковага палка 74-й гв. стралковай дывізіі. 29 красавіка пры штурме аднаго з дамоў Аляксандр Аляксандравіч знішчыў гранатай варожы кулямётны разлік, а на другі дзень першым уварваўся ў падвал дома, з аўтамата адправіў на той свет чатырох фашыстаў і ўзяў у палон сем нямецкіх афіцэраў. Ордэн Чырвонай Зоркі ўпрыгожыў гімнасцёрку Уладзіміра Нагорнага з Кузьмічоў, старшага сяржанта, памочніка камандзіра ўзвода вучэбнага батальёна 34-га гв. мотастралковага палка 12-й гв. танкавай дывізіі. Калі выбыў камандзір узвода, Уладзімір Андрэевіч замяніў яго і ўдала камандаваў падначаленымі.

Медалём «За адвагу» былі адзначаны гераічныя дзеянні радавога 5-й батарэі 282-га гв. знішчальна-супрацьтанкавага артпалка Цімафея Паўлава з Замошша, які разам з разлікам, уручную перакатваючы гармату пад страшэнным варожым абстрэлам, прамой наводкай падтрымліваў на берлінскіх вуліцах атакуючую пяхоту. Гэтым жа медалём быў узнагароджаны Пётр Мікуліч з Закальнога, сапёр 166-га гв. стралковага палка 55-й гв. стралковай дывізіі, які абясшкодзіў у берлінскіх дамах дзевяць фашысцкіх мін.

Увогуле за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў час Берлінскай стратэгічнай наступальнай аперацыі, многія ўраджэнцы Любаншчыны былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі: ордэнам Айчыннай вайны І ступені ўзнагароджаны Маісей Каплан са Старасека і Іван Муравейка з Талі, ордэнам Чырвонай Зоркі – **Яўген Гарэлька** з Дубілаўкі, Рыгор Каладзінскі з Падлуга, Іван Слівец з Малых Гарадзяцічаў і Іван Монцік з Сарачоў, ордэнам Славы III ступені – Міхаіл Шэўчык з Малых Гарадзяцічаў, Рыгор Лосік з Трайчанаў, **Андрэй Атрашонак** з Соснаў 1, медалём «За адвагу» – **Яўген Ляўчэня** з Рачэні і Антон Шыла з Касцюкоў.

**Карл Куркевіч з Любані за час баёў на тэрыторыі Германіі за кароткі час з лютага па красавік стаў кавалерам ордэна Славы трох ступеняў.**

Германія падпіша акт аб капітуляцыі 9 мая. Але першая пасляваенная цішыня аказалася нядоўгай, яе перарвалі выстралы групы нямецкіх войскаў, што адмовіліся капітуляваць і сканцэнтраваліся ў Чэхаславакіі. Савецкае камандаванне прыняло рашэнне накіраваць часці 1-га Украінскага фронту ў Прагу, дзе з 5 мая ішло паўстанне супраць акупантаў. Савецкая Армія выканала свой інтэрнацыянальны абавязак перад чэшскім народам.

**Каб узнагародзіць тых, хто прымаў удзел у Пражскай, апошняй аперацыі Савецкіх Узброеных Сіл у вайне супраць фашысцкай Германіі, быў заснаваны медаль «За вызваленне Прагі».**

Сярод узнагароджаных – нашы землякі Цімафей Анісімаў, Анатоль Росін, **Фёдар Руды** і Пётр Бенедзіктовіч (Любань), Аляксандр Браніцкі (Хацінава), Канстанцін Вішнеўскі (Малыя Гарадзяцічы), Любоў Іёкша (Любань), Піліп Кукраш (Юшкавічы), **Сцяпан Пажарыцкі** (Обчын), Міхаіл Сеўрук (Урэчча), Пётр Шапель (Кузьмічы) і многія іншыя.

Дарагую цану заплаціў савецкі народ за вызваленне Чэхаславакіі ад нацызму. Болей за 140 тысяч савецкіх воінаў загінулі на чэхаславацкай зямлі. Сярод іх нашы землякі **Пётр Жэчка** з Чабусаў (загінуў 2 мая 1945 г.), Андрэй Вяроўка з Ператока (загінуў 17 красавіка 1945 г.), Пётр Салохін з Любані (загінуў 8 мая 1945 г.).

Вечная слава героям!

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**